

**Часопіс палітычных даследаванняў “Палітычная сфера”**
*Інстытут палітычных даследаванняў “Палітычная сфера”*
*Цэнтр Мілаша Універсітэта Вітаўта Вялікага*
***Серыя: міжнародныя адносіны***

# Двухбаковыя стасункі # 20 (1) 2013

Тэрмін прадстаўлення матэрыялаў:
**15 красавіка 2013 года**
**Планаваны час выхаду: ліпень 2013**

*“Палітычная сфера” – вядучае* ***спецыялізаванае выданне*** *па палітычных і сацыяльных навуках у Беларусі. Часопіс друкуе вынікі навуковых даследаванняў з розных галін палітычнай навукі і сумежных дысцыплін. Усе артыкулы часопіса праходзяць ананімнае акадэмічнае рэцэнзаванне. Адпаведнасць навуковым стандартам, а таксама эмпірычны ці тэарэтычны ўнёсак у разуменне палітыкі, з’яўляюцца крытэрыямі для публікацыі. Выданне ўключанае ў шэраг міжнародных* ***баз навуковых публікацый,*** *у прыватнасці Central and Eastern European On-line Library, а таксама рэферуецца ў International Political Science Association (IPSA) Abstracts.*

*Часопіс выдаецца з* ***2001*** *года.*

Асноўная тэма нумару – **двухбаковыя стасункі краін** Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Нумар прысвечаны разгляду стану і асноўных тэндэнцый у дачыненнях паміж краінамі рэгіёну з асаблівым фокусам на Беларусі. Таксама плануецца разгляд уплыву на развіццё рэгіёна еўрапейскай інтэграцыі, расійскай стратэгіі знешняй палітыкі, а таксама перспектывы росту азіяцкага эканамічнага і палітычнага фактару.

**Праблематыка нумару:**
- Уплыў эканамічнага крызіса на дачыненні паміж дзяржавамі рэгіёну Цэнтральна-Усходняй Еўропы.
- Еўрапейскі, расійскі і азіяцкі фактар у развіцці рэгіёна Цэнтральна-Усходняй Еўропы
- Супрацоўніцтва і канфлікты ў рэгіёне, інтэграцыйныя праекты.
- Беларусь у двухбаковых стасунках.
- Беларуская знешняя палітыка: еўрапейскія, еўразійскія і азіяцкія ўплывы.

Да друку прымаюцца матэрыялы на **беларускай**, **рускай, англійскай,** а таксама **польскай і ўкраінскай** мовах.

Артыкулы ў часопісе друкуюцца на беларускай і рускай мовах. Рэдакцыя самастойна ажыццяўляе пераклад.

**Тэматыка матэрыялаў можа не супадаць з асноўнай тэмай нумару.**

У рэдакцыю прадстаўляецца арыгінальны тэкст, які ніколі да таго не друкаваўся ні ў выглядзе асобнага артыкула, ні як частка манаграфіі.

Артыкулы, дасланыя ў рэдакцыю, праходзяць абавязковае ананімнае **навуковае рэцэнзаванне.**

Больш падрабязна пра патрабаванні і правілы афармлення глядзіце, калі ласка, тут:
http://journal.palityka.org/wp-content/uploads/2010/12/bel1.pdf

Матэрыялы для друку ў №20 прымаюцца да **15 красавіка 2013 года.**
Кантактны адрас e-mail: info@palityka.org